УДК 94 (476) “1954/1964”: 614.2:364

# ДЗЕЙНАСЦЬ ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА БССР У СЯРЭДЗІНЕ 1950-х – пач. 1960-х гг.[1]

**Бахір Юлія Мікалаеўна**
навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі
дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”
(г. Мінск, Беларусь)
yu.bahir@yandex.ru

*Нягледзячы на наяўнасць прац, прысвечаных асаблівасцям функцыянавання грамадскіх арганізацый у БССР, дзейнасць Таварыства Чырвонага Крыжа рэспублікі недастаткова вывучана. У артыкуле разгледжаны і прааналізаваны асноўныя напрамкі і змены ў дзейнасці ТЧК БССР у сярэдзіне 1950-х – пач.1960-х гг. Асноўнымі крыніцамі для даследавання сталі архіўныя матэрыялы і выданні Таварыства Чырвонага Крыжа.*

Дзейнасць Таварыства Чырвонага Крыжа (ТЧК) заўсёды грунтавалася на прынцыпах гуманнасці і міласэрнасці, абароне агульначалавечых інтарэсаў. Арганізацыя займала значнае месца ў грамадскім жыцці БССР, аказвала дапамогу органам аховы здароўя і падтрымку насельніцтву рэспублікі. На сённяшні дзень дадзеная тэма з’яўляецца малавывучанай, тым часам як існуе неабходнасць актыўнага выкарыстання досведу арганізацыі. Мэта артыкула – прааналізаваць асноўныя напрамкі і змены

[1] Работа выканана пры падтрымцы БРФФД (праект № Г20М-093 «Потенциал общественных организаций в решении медико-социальных проблем (на примере деятельности Белорусского Общества Красного Креста в 1921–2000 гг.)»).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў дзейнасці ТЧК БССР у сярэдзіне 1950-х – пач. 1960-х гг. Асноўнымі крыніцамі для даследавання сталі матэрыялы Нацыянальнага і абласных архіваў рэспублікі, Статут ТЧК БССР (зацв. 1957 г.) і юбілейнае выданне Выканкама Саюза ТЧК і Чырвонага Паўмесяца да 100-годдзя Савецкага Чырвонага Крыжа (1967 г.).

У разглядаемы перыяд у структуры Таварыства адбыліся важныя змены, скіраваныя на паляпшэнне і актывізацыю дзейнасці камітэтаў. Кіраўніцтва Таварыства арыентавалася на павелічэнне колькасці сваіх сяброў (членаў), падрыхтоўку кадраў, працу з навучальнымі ўстановамі, прадпрыемствамі, калгасамі і саўгасамі. Важнае значэнне мела стварэнне (ініцыятар у СССР – ЦК таварыства Украіны), пачынаючы з 1957 г., дарожных камітэтаў і, па ініцыятыве ЦК таварыства РСФСР, участковых камітэтаў у сельскай мясцовасці, а таксама правядзенне Выканкамам агульнасаюзных аглядаў работы райкамаў і пярвічных арганізацый [1, с. 155]. На ІІІ Усесаюзным з'ездзе ў 1954 г. быў прыняты шэраг прынцыповых рашэнняў, скіраваных на далейшае развіццё дзейнасці Таварыства ў сферы аховы здароўя. Прадугледжвалася ўмацаванне камітэтаў за кошт замацавання медыцынскіх работнікаў, пашырэнне прапаганды медыцынскіх і гігіенічных ведаў сярод насельніцтва. З'езд паклаў пачатак усталяванню больш цесных сувязей паміж органамі аховы здароўя і камітэтамі Таварыства [1, с. 154, 155; 2, лл. 2, 6–8].

Практычная праца камітэтаў ажыццяўлялася супольна з органамі аховы здароўя, асветы, фарміраваннямі грамадзянскай абароны (МППА-ГА) (у артыкуле масавыя формы падрыхтоўкі насельніцтва не разглядаюцца – аўт.) і камітэтамі ДТСААФ. Так, калі напачатку 1950-х гг. усе намаганні былі скіраваны на выкананне загаду Міністра аховы здароўя СССР ад 11 жніўня 1947 г. “Аб прыцягненнні да работы органаў аховы здароўя арганізацый таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца”, то ўжо з кастрычніка 1954 г. дзейнічаў загад № 218 “Аб сумеснай працы органаў аховы здароўя з арганізацыямі таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца” [1, з. 154]. У загадзе даваліся канкрэтныя ўказанні пра формы і метады выкарыстання патэнцыялу ТЧК. У пач. 1950-х гг. у справаздачах беларускай арганізацыі засяроджвалася ўвага на недастаткова развітую дзейнасць па разгортванні агітацыйна-масавай работы. Аднак ужо ў 2-й палове 1950-х гг. назіралася яе актывізацыя [3, л. 29; 4, л. 64].

З 1954 да 1965 г. колькасць членаў ТЧК павялічылася ўдвая і склала 2301052 чалавек, або 27% насельніцтва рэспублікі. Калі ў 1954–1956 гг. тэмпы прыросту былі невялікімі – усяго 2–4% , то ў перыяд 1957–1964 гг. яны складалі штогод 10% да папярэдняга года [5]. Шмат у чым гэта было



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

абумоўлена пачаткам масавага руху за бязвыплатнае донарства, якім займаўся Чырвоны Крыж, а таксама зніжэннем узроставага цэнзу на уступ ў рады ТЧК: паводле зменаў у Статуце, зацверджаным у 1957 г. Пастановай СМ БССР № 651 і адобраным VII рэспубліканскім З'ездам Таварыства, навучэнцы маглі стаць членам ЧК не з 12-ці, а 10-гадовага ўзросту [6, з. 6]. У новым Статуце ТЧК БССР удакладняліся і задачы, што стаялі перад арганізацыяй. Новым пунктам стала развіццё самадзейнасці сяброў Таварыства і насельніцтва па паляпшэнні справы аховы народнага здароўя. Вялікая ўвага нададзена рабоце з насельніцтвам, санітарна-абарончай падрыхтоўцы насельніцтва і выдавецкай дзейнасці [6, з. 5, 6].

ЦК Таварыства і Міністэрства аховы здароўя БССР штогод распрацоўвалі комплексныя планы правядзення сумесных мерапрыемстваў. На пасяджэннях калегіі Міністэрства і Прэзідыума ЦК Таварыства сістэматычна абмяркоўваліся пытанні падрыхтоўкі і выкарыстання санітарнага актыву ў аздараўленчай рабоце. Аднак у пасляваенныя гады ў сувязі з тым, што ўсе сілы і сродкі накіроўваліся на аднаўленне гаспадаркі, гэта было цяжка арганізаваць. Прыклад падалі актывісты г. Барысава, якія ў 1955 г. пачалі масавы рух на тэрыторыі БССР па ачышчэнні населеных пунктаў услед за Азербайджанскай (1947 г.) і Узбекскай ССР (1955 г.) [1, с. 153]. У спаборніцтва ўключыліся працоўныя Гомеля, Магілёва, Брэста, Бабруйска. Вялася таксама праца па выкарыстанні санактыва медработнікамі з мэтай выканання пастановы ЦК КПБ і СМ БССР ад 1956 г. па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Былі праведзены конкурсы на лепшыя пасёлак, дом, калгас і ферму, якія актывізавалі рух за санітарную культуру [7, лл. 55–65].

Агітацыйна-масавая работа ў разглядаемы перыяд была накіравана на выкананне планавых заданняў, на аказанне дапамогі прадпрыемствам, адукацыйным установам у барацьбе за санітарную культуру і здароўе працаўнікоў і навучэнцаў. З мэтай павышэння ўзроўню гэтай работы на месцах ствараліся лектарскія групы ва ўсіх абласных, гарадскіх і раённых камітэтах ТЧК БССР. Да канца 1956 г. у 5 абласных камітэтах рэспублікі былі створаны лектарскія групы [1, л. 27, 28]. У цэлым, адсутнасць належнай матэрыяльнай падтрымкі адмоўна адбівалася на якасці работы ЧК – лектарскія групы працавалі бясплатна і ў многіх выпадках займаліся прыпіскамі [3, л. 64]. Работа ТЧК БССР шырока асвятлялася ў СМІ – за 1956 г. было апублікавана 11056 артыкулаў, арганізавана 238 кіначасопісаў і 237 выступаў па радыё. Распрацаваных лекцый у 1956 г. было 12, але за год здолелі пашырыць 8130 адзінак літаратуры, выдаць 6 плакатаў і санбюлетэняў. Абкамам у Віцебску было выдадзена 2 бюлетэні, у Гомелі – 1,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

у Магілёве – 2 [3, л. 32]. У 1959 г. ЦК ТЧК БССР выдаваў плакаты на рускай і беларускай мовах, прысвечаныя папярэджанню траўматызму (сумесна с ДАІ) і донарскаму руху [7, л. 38].

Праца па прапагандзе донарства ТЧК пачалася яшчэ ў 1930-я гг., у першыя пасляваенныя гады тэмпы работы запаволіліся. Да канца 1950-х гг. донарства разгарнулася ўжо як шырокі патрыятычны рух. Амаль з першых дзён арганізацыі Службы крыві камплектаванне кадраў донараў было даручана камітэтам ТЧК. Увядзенне новых прэпаратаў, пашырэнне медыцынская практыкі, развіццё хірургіі лёгкіх і сэрца, увядзенне пералівання крыві патрабавалі значнага павелічэння колькасці донарскай крыві. Як адзначыў III Усесаюзны З'езд (1954 г.), значным прабелам была слабая прапаганда донарства сярод насельніцтва і невялікая кольлкасць донараў. Таму Міністэрства аховы здароўя і ЧК у 1955 г. прынялі шэраг мер да выпраўлення становішча [1, с. 212–213]. Да таго ж, у гэты час донарская служба ТЧК БССР актыўна развівала напрамак бязвыплатнага донарства. Кропкай адліку яго адраджэння прынята лічыць 1957 г., калі работніцы ленінградскай фабрыкі "Верацяно" звярнуліся ў гаркам ЧК с прапановай здаць кроў бязвыплатна. У БССР ініцыятарам стала Гродзенская вобласць [9, л. 39]. Для пашырэння сеткі донарскіх кадраў кожнаму абкаму, райкаму даваліся заданні, якія распрацоўваліся сумесна с БелНДІ пералівання крыві і Міністэрствам аховы здароўя. Планавыя паказчыкі размяркоўваліся па некалькіх групах – група рэзерву, актыўныя донары, у ліку якіх вылучаліся донары, якія здавалі кроў на бязвыплатнай аснове. На 1959 г. колькасць актыўных донараў па БССР складала 38020, а бязвыплатных – 22974. Колькасць донараў з рэзерву перавышала 150000 [7, лл. 67, 76].

Развіваліся міжнародныя сувязі с іншымі рэспублікамі па лініі дзейнасці ТЧК. Напрыклад, старшыні ЦК ТЧК БССР у 1954 г. быў накіраваны ліст з просьбай прыняць удзел у рэспубліканскім з'ездзе эстонскай арганізацыі ТЧК [10, л. 10]. У 1958 г. запрашэнне было атрымана ад УССР. Адзначым таксама, што да 1958 г. Выканкам СТЧК і ЧП СССР выконваў абавязкі па вышуку на тэрыторыі СССР савецкіх грамадзян, якія страцілі сувязь са сваімі роднымі. Але па прапанове МУС СССР і Выканкама СТЧК і ЧП СССР гэты абавязак з яго быў зняты [11, л. 1].

Чырвоны Крыж БССР ніколі па-сапраўднаму не быў незалежным у вызначэнні накірункаў працы і заўсёды заставаўся пад уплывам дзяржаўных органаў, часткова кампенсаваў недахопы сістэм сацыяльнага забеспячэння і аховы здароўя. Змяненні паўнамоцтваў сведчаць пра імкненне дзяржаўных органаў засяродзіць намаганні Таварыства на пэўных прыярытэтных напрамках. Магчымасці шырокай агітацыйна-масавай работы ТЧК,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

наяўнасць значнага чалавечага рэсурсу, сувязь са СМІ дапамагалі вывесці ўзаемадзеянне грамадскай арганізацыі і дзяржаўных органаў на новы узровень без вялізных фінансавых выдаткаў. Так, устанаўленне асаблівага дня, які б нагадваў пра клопат дзяржавы аб здароўі насельніцтва, стала значным фактарам у справе прыцягнення увагі да праблем фарміравання здаровага ладу жыцця, неабходнасці павышэння санітарнай і гігіенічнай культуры ў рэспубліцы. Такім мабілізуючым фактарам у руху за аздараўленне навакольнага асяроддзя, умоў працы і быту стаў Дзень здароўя, зацверджаны СМ БССР у 1964 г. З гэтага часу ТЧК далучылася да арганізацыі свята, праводзіла нядзельнікі і месячнікі па добраўпарадкаванню, агляды-конкурсы на лепшыя санітарна-гігіенічныя ўмовы на прадпрыемствах [8, л. 44].

Такім чынам, у выніку даследавання дадзенай тэмы можна зрабіць наступныя высновы. Дзейнасць ТЧК БССР у сярэдзіне 1950-х – пач. 1960-х гг. характарызуецца ўдасканаленнем структурнай перабудовы арганізацыі, павелічэннем колькасці яе членаў, узмацненнем уплыву дзяржаўных органаў у вызначэнні напрамкаў развіцця Таварыства згодна з патрабаваннямі часу, і, як вынік, адпаведным пашырэннем агітацыйнай дзейнасці. Новым для Таварыства стала развіццё донарства на бязвыплатнай аснове, прынятце на сябе часткі арганізатарскіх функцый у святкаванні Дня здароўя, добраўпарадкаванні тэрыторый, руху за санітарную культуру. Дзейнасць Таварыства набыла шмат у чым санітарна-медыцынскі характар.

**Спіс літаратуры**

1. Сто (100) лет Красного Креста в нашей стране / Испол. ком. Союза о-в Красного Креста и Красного Полумесяца СССР. – М. : Медицина, 1967. – 298 с.

2. ДАВВ. – Ф. 2889. Воп. 1. Спр. 56.

3. НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 228.

4. НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 81.

5. Састаўлена на аснове: 1954, 1955 гг. – НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 188; 1956,1957,1958 гг. – НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 284; 1961, 1962, 1963 гг. – НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 441. Л.45; 1964 г. – НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3.Спр. 399. Л. 170; Спр. 468. Л.19.

6. Статут Таварыства Чырвонага Крыжа Беларускай ССР: [Зацв. СМ БССР 18.10.1957 г.] / ЦК ТЧК. – Мінск, 1958. – 15 с.

7. НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 322.

8. НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 668.

9. НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 682.

10. НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 158.

11. НАРБ. – Ф. 254. Воп. 3. Спр. 306.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова